**Літаратура**

1. Плотка, А. «Spes Phtisica» [Электронны рэсурс].– Рэжым доступу: https://soundcloud.com/baisan88/sets/baisan-spes-phtisica.– Дата доступу: 02.05.2019.
2. Рыжкоў, В. Дзверы, замкнёныя на ключы.– Мінск: І. П. Логвінаў, 2010.– 108 с.
3. Схелтйенс, В. Сетература: новое литературное движение? [Электронны рэсурс] // Сетевая словесность.– Режим доступа: https://www.netslova.ru/teoriya/werner.html.– Дата доступа: 10.03.2019.
4. What is E-Lit? [Electronic resource] // Electronic Literature Organization.– Mode of access: http://eliterature.org/what-is-e-lit/.– Date of access: 02.05.2019.

УДК 821.161.3.09 (092)

І. С. Мяцеліца, мнс аддзела
беларускай літаратуры XX і XIX стст.
(ЦДБКМіЛ НАН Беларусі, г. Мінск)

## МАЛАЯ РАДЗІМА: ВОБРАЗ МІНСКА Ў КНІЗЕ АНТОНА РУДАКА «ВЕРХНІ ГОРАД»

Адлюстраванне ў беларускай паэзіі вобраза малой радзімы часта натуральна перасякаецца з магістральнай для айчыннай літаратуры вясковай тэматыкай. Да апошняй трэці XX стагоддзя большасць аўтараў, чыё творчае сталенне і раскрыццё пісьменніцкага таленту прайшло ў гарадскім асяроддзі, мела вясковае паходжанне. Пры ўсёй разнастайнасці тэматычнага дыяпазону ў творчасці кожнага з іх ёсць месца вершам, прысвечаным асобным рэгіёнам, вёскам, мястэчкам Беларусі, з якімі звязаны ўспаміны дзяцінства і юнацтва. Сучасныя паэты з падобнай біяграфіяй і сёння поўняць скарбонку вясковай лірыкі, апісваючы ў вершаваных радках дарагія сэрцу мясціны. Аднак побач з імі на літаратурнай ніве расце новае пакаленне пісьменнікаў, для каго малой радзімай з'яўляюцца вялікія гарады. Адзін з іх – перспектыўны малады аўтар Антон Рудак, для якога родны Мінск стаў крыніцай натхнення для напісання дэбютнага зборніка паэзіі «Верхні горад».

Нават калі не браць ва ўлік месца нараджэння аўтара і назву зборніка, яго змест беспамылкова ўказвае на тое, што менавіта Мінск (за рэдкім выключэннем), а не іншы населены пункт стаў галоўным героем дадзенай кнігі (вершы «Чароўная песня Нямігі», «Могілкі Менска», «Аэрадромная», «Травень. Чэрвенка»,

«Серабранка» і інш.). У паэтычных радках узнікаюць знаёмыя кожнаму мінчаніну мікрараёны, праспекты, вуліцы, станцыі метро, паркі. Амаль тысячагадовы ўзрост Мінска – нагода для А. Рудака асэнсаваць розныя перыяды існавання роднага горада (вершы «Чароўная песня Нямігі», «Могілкі Менска», «29.10.1937», «Падпольніцкі раманс» і інш.) і сябе як часткі яго гісторыі («1989», «Трамвай», «Верхні горад», «Рэквіем» і інш.). У паэтычным зборніку знайшлі сваё адлюстраванне важныя падзеі ў жыцці ўсёй краіны, якія, бясспрэчна, адбіліся на гісторыі яе сталіцы і глыбока хвалююць аўтара. Ён неаднаразова звяртаецца да трагічных старонак летапісу Мінска, у прыватнасці, падзей Вялікай Айчыннай вайны, якія памятаюць не толькі людзі, але і горад. Радок з верша «Фотакарткі» «*вайна прайшла – а далей не страшна*» – прызнанне лірычнага героя кнігі ў тым, што няма нічога больш жудаснага за пераждытыя гады ваеннага ліхалецця. Творы на гэту тэму пазбаўлены гераічнага пераможнага пафасу, насычаны бытавымі дэталямі і апісаннямі, прасякнуты балючым усведамленнем вайны як прычыны асабістай трагедыі радавога чалавека – салдата, партызана, палоннага, ворага… І ўсе гэтыя лёсы на старонках кнігі перасякаюцца ў горадзе, які стаў нямым сведкам страшных падзей. А. Рудак не засяроджвае пісьменніцкую ўвагу на крывавых баях, жахлівых фактах савецка-нямецкага супрацьстаяння, але праз апісанне гарадскіх рэалій дакладна перадае атмасферу месца «*завашыўленага і бруднага, прапахлага потам, тытунем і крывёй*» [1, с. 22]. Лейтматывам вершаў пра вайну як самую страшную разбуральную сілу становіцца ўсведамленне каштоўнасці мірнага існавання. Так, у вершы «Музыка ў паветры» ў аснову сюжэта аднаўлення горада пакладзена не фармальная яго адбудова, а ўмацаванне мірнага стану як галоўнай жыццёвай мэты: «*…і наўзамен руінаў пакінутых бомбамі / <…> героі падполля гурмою супольна з палоннымі // <…> будуюць кардонны горад блытаюць карты / каб вайна нават калі і вернецца ўжо не здолела / пазнаць тыя самыя вуліцы і заблукала*» [1, с. 3]. У вершы «Godzina W» аўтар няхай і выходзіць геаграфічна за межы Мінска, але зноў жа праз апісанне гарадской прасторы акцэнтуе ўвагу на той жа думцы: «…а ты ідзеш па Длугай-доўгай вуліцы / і марыш, што нідзе няма вайны» [1, с. 24].

Кампазіцыйнай і сэнсаўтваральнай асновай многіх вершаў, якія маюць вялікі храналагічны дыяпазон, становяцца часавыя

і падзейныя паралелі, што падтрымліваюцца адпаведнымі вобразнымі перасячэннямі: «*Могілкі Менска даўно абярнуліся скверамі, / Зніклі крыжы, надмагіллі зраўнялі будьдозеры. / Толькі злавесна-трывожнымі плямамі шэрымі / даўняе места хаваецца ў спляжаным горадзе*» [1, с. 5]. Гэты і блізкія яму па настроі вершы яднаюць урбаністычную лірыку А. Рудака з «вясковымі» вершамі пра малую радзіму яго літаратурных папярэднікаў. У іх таксама выразна адчуваецца імлівасць, зменлівасць часу, настальгія, балючае стаўленне да заняпаду ці (у выпадку з горадам) любых – штучных і натуральных – знешніх змен, перабудовы асаблівых, блізкіх сэрцу мясцін, з якімі лірычны герой адчувае моцную сувязь. Нездарма час ад часу сярод апісанняў гарадскіх рэалій узнікаюць цёплыя, шчымлівыя вясковыя вобразы. Так, у пачатку верша «Музыка ў паветры» наўмыснае сутыкненне ў адным паэтычным радку аддаленых па характару вобразаў размывае гістарычную мяжу паміж сучасным Мінскам і звычайнымі беларускімі вёскамі, якімі калісьці была і беларуская сталіца: «*З вечаровых сеансаў паддатыя кінамеханікі / прыходзяць дахаты адначасова з каровамі / трамваі ўначы звіняць на аціхлых ускраінах / дзе глебу раз-пораз разорваюць шматпавярховікі*» [1, с. 3]. Паказальны ў гэтым плане верш «Горад вёсак», у якім дзяцінства лірычнага героя трывае да той пары, пакуль горад успрымаецца мазаікай з вёсак – небяспечных, беклапотных месцаў «*светлых сноў і добрых казак*» [1, с. 8]. Матыў шкадавання і страты «былога горада» адчуваецца таксама ў вершы «Заваказалле». Лірычны герой з асаблівай цеплынёй апісвае сталічны раён, не кранутым новай забудовай, «*дзе хацінкі, як міражы, прытуліліся ўздоўж чыгункі, / дзе ўспамінаў і мараў схоў, дзе маўклівая яблынь варта, / дзе адбіткі дзіцячых сноў, не нанесеныя на карту, / дзе ў калодзежах спяць вякі, не прыдушаныя бетонам, / дзе завулкі і тупікі захавалі свае імёны...*» [1, с. 10]. Варожымі яму паўстаюць і «*недарэчны, цяжкі, груваскі*» шэры дом, і іншыя будынкі, якія бетоннай мяжой адразаюць горад ад яго мінулага [1, с. 10].

У зборніку «Верхні горад» вобразныя трансфармацыі сучаснага Мінска выступаюць своеасаблівым паказчыкам унутраных змен лірычнага героя, характар якіх і вызначае стаўленне да пэўных падзей і аб'ектаў, адлюстраваных у кнізе. Так, Мінск як светлы ўспамін дзяцінства – бесклапотны, святочны, як і першыя

гады хлапечага жыцця («*і лятуць угару феерверкі / і грукочуць салюты / ўночы / зорка долу без парашута / раптам скочыць*» [1, с. 36]). У вершах жа «Аэрадромная» і «1989» (год нараджэння аўтара) лірычны герой пераасэнсоўвае сваё дзяцінства, фактары фарміравання ўласнага светапогляду і каштоўнасных арыенціраў праз прызму гісторыі Мінска і навязаных стэрэатыпаў, датычных і да горада, і да асобы. Вобраз сталіцы набывае іншыя рысы, а асобныя радкі – то саркастычнае, то настальгічнае гучанне («*наш дом будавалі, вядома ж, палонныя немцы / (а можа, не немцы. і нават зусім не палонныя) / але на франтоне пакінулі / серп ды молат, і год пабудовы. / адсюль у мяне любоў да рэтра-эстэтыкі / і таталітарнай сімволікі ўвогуле*» [1, с. 38]; «*І атлас пакуль стракацеў бялюткімі плямамі, / і ямы ў паветры няўцямна зеўралі з бездані, / і цэлы свет быў падзелены толькі шлагбаўмамі, / апушчанымі над чыгуначнымі пераездамі*» [1, с. 59]). Сталіца часоў маладосці аўтара з верша ў верш поўніцца пазнавальнымі рэаліямі Мінска XXI стагоддзя і нібы пераймае характар лірычнага героя: становіцца хуліганістай, распушчанай, дзёрзкай. На старонках зборніка з'яўляюцца «*непраходныя пад'езды і неправетраныя памяшканні*» [1, с. 53], начоўкі ў РАУСах, аўтазакі, напоўненыя музыкай з «*соняў, самсунгаў, нокіяў*» двары, начная Маякоўка і веладарожныя ўзбочыны Серабранкі. Створаны пісьменніцкім талентам аўтара вобраз горада мімікруе пад лірычнага героя і становіцца ключом да разумення яго ўнутранага стану.

На старонках зборніка «Верхні горад» малая радзіма аўтара паўстае перад чытачом у розных іпастасях: і як месца гістарычнай памяці, і як сведка дзяцінства і маладосці лірычнага героя. Асаблівае месца ў кнізе займае асэнсаванне аўтарам розных перыядаў гісторыі беларускай сталіцы, у прыватнасці, падзей Вялікай Айчыннай вайны. Трансфармацыя вобраза сучаснага Мінска цесна звязана са светапогляднымі зменамі лірычнага героя вершаў.

**Літаратура**

Рудак, А. Верхні горад.– Мінск: Кнігазбор, 2014.– 83 с.